**Калі чытаем апавяданне** або раман, перад намі **праходзяць жыццёвыя** падзеі, вобразы людзей, **пейзажы. Мы бачым** рэальныя прадметы на **малюнках** і палотнах мастакоў. Н , а што ж **музыка?** Неадназначнасць музыкі адзначалі многія. "Музыка пачынаецца там, дзе канчаюцца словы" (Г.Гейнэ). Пачнем з таго, што ў музыцы таксама адлюстроўваюцца рэальныя прадметы. Многа прыкладаў, калі цэлыя творы і асобныя старонкі прысвячаюцца адлюстраванню прыроды і жыцця людзей. Нарэшце, музычная літаратура багатая партрэтамі, у якіх адлюстраваны многія знешнія рысы розных людзей - амаль да іх паходкі, жэстаў і галасоў. Музыка можа адлюстраваць сонечны дзень і глухую ноч, зару і бліскавіцу. Даўно заўважана аналогія паміж музыкай і мовай. "Добра вымаўленае слова - ужо музыка", - гаварыў К.Станіслаўскі. Эстэтычнае ўспрыманне музычнай інтанацыі дапускае яе спалучальнасць з чалавечай мовай, а праз яе і з чалавечымі думкамі і пачуццямі. Гэтыя абставіны дазваляюць успрымаць музычны твор не як гукагалаваломку, а як адлюстраванне душы і розуму чалавека.

Музыцы даступна і ўвасабленне думак. Асабліва вялікія магчымасці ў гэтых адносінах музыка набывае ў праграмных сачыненнях, назвы якіх, як правіла, увасабляюць асноўны змест музычнага твора. Часам у якасці праграмы можа выступаць вобразны змест твораў мастацтва (жывапіс, скульптура, нават архітэктура). Змест музыкі -- гэта перапляценне, зліццё пачуццяў і настрою з адлюстраваннем чалавека і прыроды, з роздумам аб свеце. Ёсць яшчэ адзін важны бок у змесце музыкі, як і ўсякага мастацтва, -- эстэтычная ацэнка рэчаіснасці. Ацэньваючы прадмет эстэтычна, мы вольна ці нявольна суадносім яго з тым уяўленнем аб цудоўным, з тым эстэтычным ідэалам, які існуе ў нашай свядомасці.

Эстэтычныя ідэалы ў розных людзей розныя. Яны звязаны з класавым светапоглядам і грамадскімі імкненнямі, з нацыянальнымі, гістарычнымі і сацыяльнымі ўмовамі жыцця. У рэальным жыцці мы далёка не заўсёды даем прадметам эстэтычную ацэнку, а ў мастацтве яна прысутнічае заўсёды. Музыка, глыбока ўспрынятая і асэнсаваная чалавекам, уздзейнічае на яго адносіны да свету, на ўсё яго разуменне. Гэта канчатковы вынік складанага працэсу ўспрымання і перажывання музыкі.

Што ж такое музычная культура асобы? Паколькі мастацкая культура грамадства выступае ў якасці унікальнай гарманічна арганізаванай сістэмы мастацкіх каштоўнасцей розных відаў мастацтва, якія дазваляюць гарманічна функцыянальна ўздзейнічаць на асобу (выконваюць выхаваўчыя, эстэтычныя, пазнавальныя і інш.функцыі), то музыка ў найбольшай ступені нясе мастацкую культуру. Таму музыка садзейнічае арганізацыі мастацкага спосабу жыцця. Мастацкі спосаб жыцця можна разглядаць як паказчык узроўню культуры асобы. Удзел у музычнай творчасці праз розныя формы музычнай дзейнасці, развіццё маральна-эстэтычных бакоў асобы пад уздзеяннем яе музычна-культурнага патэнцыялу, высокі ўзровень ведаў у музыцы і ацэначных уяўленняў - - усё гэта прыметы, што вызначаюць якасць музычнай культуры суб'екта, яго ўзровень музычна-культурнага развіцця.

Таму вельмі важна разумець і прапусціць скрозь прызму сваёй асобы музыку розных эпох і стыляў, навучыцца тонка рэагаваць на ход музычнай думкі, яе настрой. "Успрымаць мастацтва можа быць гэтак жа цяжка, як і ствараць яго", - гаварыў А.Талстой.

Пякуцька А.В.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## СТАРАДАЎНЯЯ ДУХОЎНАЯ ХАРАВАЯ МУЗЫКА Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКА АМАТАРСКАГА ХАРАВОГА КАЛЕКТЫВУ

У сучасны момант ва універсітэцкай сістэме адукацыі адбываюцца сур'ёзныя змены, сутнасць якіх -- у павышэнні эфектыўнасці падрыхтоўкі кадраў. Асобнае месца ў гэтай сувязі адводзіцца фарміраванню кіраўніка аматарскага харавога калектыву новага тыпу.

Такая неабходнасць узнікла з адраджэннем нацыянальнай культуры. У апошнія гады атрымала сваё развіццё старадаўняя духоўная харавая музыка. У Мінску і іншых гарадах рэспублікі пашыраецца ўжо існуючая вялікая сетка хароў старадаўняй музыкі. Але іх кіраўнікі ў сваёй большасці не маюць спецыяльнай падрыхтоўкі. Хормайстры такіх калектываў усё больш адчуваюць неабходнасць павышэння прафесійнага ўзроўню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Старадаўняя духоўная музыка з'яўляецца той жыватворнай галіной харавога мастацтва, у якой студэнт можа знайсці для сябе не толькі глебу для высокакваліфікаванай падрыхтоўкі, але і выток творчага інтарэсу.

На жаль, працяглы час яе мастацкая вартасць замоўчвалася, а тое, што выконвалася, ішло ў асноўным са змененымі тэкстамі. Наша старадаўняя духоўная музыка была непажаданай госцяй у канцэртных залах, дзе ў той жа час з вялікім поспехам выконвалася духоўная музыка заходніх кампазітараў.

Аднак нягледзячы на такую забарону і ганенне знікнуць зусім духоўная музыка не магла. Яна працягвала існаваць у сэрцы і памяці многіх, хто меў дачыненне да яе, дапамагала людзям выжыць, пераадолець цяжкія выпрабаванні, захоўваючы ў чалавеку духоўнасць.

Старадаўняя духоўная харавая музыка Беларусі з'яўляецца адной са старажытных музычных культур Еўропы. Народная песня і прафесійнае спеўнае мастацтва адчыняюць для нас эмацыянальны свет нашых продкаў. У творах старадаўняга спеўнага мастацтва знайшлі адлюстраванне жыццё народа, яго гісторыя, ідэалы, любоў да роднай зямлі. У старадаўняй харавой музыцы мы адчуваем гонар за нашу нацыю. Дадзены від мастацтва дае глыбокую эстэтычную асалоду.

Найбольш дасканалымі і традыцыйнымі для старадаўняй харавой славянскай музыкі былі спевы a'cappella. Гэта форма музыкі запазычана з Візантыі, але і ў нас існавалі традыцыі спеву a'cappella ў народным музычным мастацтве. Гэта форма патрабуе ад выканаўцаў высокай вакальнай тэхнічнай падрыхтоўкі. У музыцы праваслаўнай царквы са старажытнага часу выкарыстоўваліся толькі харавыя спевы a'cappella.

Мы ведаем геніяльныя ўзоры харавых твораў, напісаных у гэтым стылі кампазітарамі XVII--XX стст.: У.Цітовым, М.Беразоўскім, А.Ведзелем, Д.Бартнянскім, П.Чайкоўскім, С.Рахманінавым.

У беларускай музыцы харавыя спевы адыгрываюць асобную ролю дзякуючы непасрэднай сувязі з народнай творчасцю. У перыяд фарміравання славянскіх народнасцей, калі беларуская музыка пачала набываць нацыянальную акрэсленасць, харавыя спевы ўваходзілі ў жыццё народа як неад'емная частка музычнай культуры.

На працягу стагоддзяў збіраліся духоўныя песнапенні. Іх аўтарамі былі і масцітыя кампазітары, і невядомыя аўтары, стыль якіх разнастайны -- ад аскетычных аднагалосных мелодый да вельмі прыгожага і складанага шматгалосся. Кожнае наступнае пакаленне кампазітараў духоўнай музыкі ўносіла свой уклад у развіццё царкоўнага спеўнага мастацтва. Яркая індывідуальнасць і самабытнае майстэрства выявіліся ў творах буйной формы, у шматчастковых духоўных канцэртах. У іх адлюстроўваюцца танчэйшыя адценні чалавечых перажыванняў, глыбокі душэўны роздум.

Музыка старадаўніх царкоўных спеваў аднаўляе сувязь часу, народаў, служыць маральным прыкладам таму, што мы робім, да чаго імкнуцца наша сэрца, розум.

Зусім відавочна, наколькі шмат функцыянальная роля старадаўняй музыкі ў сістэме падрыхтоўкі кіраўніка аматарскага калектыву. На занятках харавога класа ажыццяўляецца прафесійнае і асобаснае фарміраванне будучага хормайстра, падсумоўваюцца асноўныя вакальна-харавыя і дырыжорскія навыкі.

Харавы рэпертуар, складзены з твораў старадаўняй музыкі, з'яўляецца не толькі сродкам нацыянальна-культурнага выхавання студэнтаў, але дапамагае творчаму росту харавога калектыву.

Хормайстар павінен быць адначасова і выхаваўцам, быць тонкім, шчырым у перадачы сваіх перакананняў і ведаў.

Старадаўняя духоўная музыка адыгрывае важную ролю не толькі ў навучальна-пазнавальных ці духоўна-эстэтычных пытаннях, але і ў ажыццяўленні галоўнай задачы -- развіцці музычнай культуры Беларусі.

"Без засваення аграмаднай культурнай спадчыны мінулага немагчыма раскрыць творчы патэнцыял сучаснага чалавека і ўсяго народа", - сказаў выдатны харавы дырыжор В.М.Мінін.

Такім чынам, старадаўняя духоўная музыка ў навучальным працэсе адыгрывае ролю таго фундамента, ад пабудовы якога залежыць уся сістэма падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў аматарскіх харавых калектываў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ